ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№№ 2, 3 (759, 760) ● Пятніца, 23 студзеня 1970 г. ● Цана 3 кап. ● Год выдання XXIII

## КАНФЕРЭНЦЫЯ НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ

21—22 студзеня на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта праходзіла рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя па тэме «Навучанне вуснай мове ў працэсе выкладання рускай мовы іншаземцам», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У ёй прынялі ўдзел выкладчыкі рускай мовы мінскіх політэхнічнага і медыцынскага інстытутаў, педагагічнага інстытута замежных моў, інстытута народнай гаспадаркі, горацкай сельгасакадэміі і іншых навучальных устаноў Беларусі.

На канферэнцыі быў прачытан і абмеркаван шэраг цікавых дакладаў: Л. А. Міцкевіч (БДУ)—«Выкарыстанне матэрыялаў аб Леніне ў працэсе навучання рускай мове на падрыхтоўчым факультэце», Л. І. Грыгаровіч (БПІ)—«Выкарыстанне матэрыялаў аб Леніне ў вучэбна-выхаваўчай рабоце», М. А. Хазяева (інстытут замежных моў)—«Актыўныя метады навучання рускай мове замежных студэнтаў» і іншыя.

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

У свядомасці савецкіх людзей, народаў сацыялістычных краін, міжнароднага рабочага класа, усіх працоўных свету вясна 1970 года арганічна спалучаецца са святкаваннем 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Гісторыя не ведае чалавека, які б мог раўняцца з Леніным па шырыні папулярнасці і колькасці паслядоўнікаў, уплыву на гістарычныя падзеі. Прадаўжаючы справу вялікіх настаўнікаў пралетарыяту Маркса і Энгельса, якія ператварылі сацыялізм з утопіі ў навуку, Ленін усебакова ўзбагаціў марксізм і злучыў яго з практыкай рэвалюцыйнай барацьбы і сацыялістычных пераўтварэнняў. Раскрыццю праўдзівасці і важнасці асноўных палажэнняў ленінскага вучэння ў сувязі з актуальнымі задачамі сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва, усяго рэвалюцыйна-вызваленчага руху прысвечан нядаўна апублікаваны дакумент ЦК КПСС—Тэзісы «Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна».

Тэзісы сталі асновай шырокай ідэйна-выхаваўчай і прапагандысцкай работы, якую праводзяць партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія арганізацыі, друк, радыё, тэлебачанне, таварыства «Веды», навуковыя і культурна-асветніцкія ўстановы ў сувязі з надыходзячым юбілеем.

У Тэзісах ЦК КПСС ахарактарызаваны гістарычныя прадпасылкі і ўмовы ўзнікнення ленінізма, паказана шматгранная, сапраўды гіганцкая тэарэтычная, прапагандысцкая і арганізатарская дзейнасць Леніна: стварэнне ім рэвалюцыйнай марксісцкай партыі новага тыпу, барацьба супраць усякага роду права- і леваапартуністычных цячэнняў у расійскім і міжнародным рабочым руху, кіраўніцтва падрыхтоўкай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і ўстанаўленне ўлады рабочага класа.

Сусветна-гістарычная заслуга Леніна, партыі бальшавікоў у тым, што яны ўзначалілі стварэнне першага ў свеце сацыялістычнага грамадства, заснавалі надзейную дзяржаўную базу міжнароднага вызваленчага руху. Пабудова сацыялізма ў СССР прадэманстравала асноўныя рысы будучага развіцця ўсіх краін.

У Тэзісах падкрэсліваецца рэалізм ленінскага падыходу да будаўніцтва сацыялізма. Уладзімір Ільіч заўсёды высмейваў тых, хто з сёння на заўтра чакаў паяўлення нейкага ідэальнага грамадства, свабоднага ад супярэчнасцей і цяжкасцей. Ён мысліў сацыялізм як цэласны, жывы арганізм. Менавіта на гэты бок ленінскага разумення новага ладу ўказваецца ў Тэзісах ЦК КПСС: «Развіццё сацыялізма—складаны працэс пераходу ад ніжэйшых форм яго грамадскай арганізацыі да вышэйшых у залежнасці ад таго, «што можна б назваць ступенямі эканамічнай спеласці камунізма».

Кіруючыся ленінскімі ўказаннямі, работнікі ідэалагічнага фронту прызваны паўней і глыбей раскрываць абгрунтаванасць, магчымасць выканання задач камуністычнага будаўніцтва, паказваючы ў той жа час іх складанасць. Нельга сеяць «аблегчаныя» ўяўленні аб працэсе барацьбы за камунізм.

Важнейшай функцыяй тэарэтычнай работы Ленін лічыў удасканаленне рэвалюцыйнай ідэалогіі. «Толькі авалодаўшы сацыялістычнай ідэалогіяй,—гаворыцца ў Тэзісах,—працоўныя масы пераходзяць ад разумення сваіх цякучых патрэб і непасрэдных задач да ўсведамлення карэнных інтарэсаў і гістарычных перспектыў». Ва ўмовах узмоцненага націску буржуазных і дробнабуржуазных поглядаў без пастаяннай ідэалагічнай работы немагчыма правільная палітычная арыенціроўка мас, мабілізацыя іх на свядомую барацьбу за сацыялізм і камунізм.

Авалоданне марксісцка-ленінскімі прынцыпамі стала не толькі доўгам, але і імкненнем, неабходнасцю савецкіх людзей, асабліва моладзі, якой трэба будзе да канца ўзводзіць светлы будынак камунізма. Неабходна ўсімі сродкамі вуснай і пісьмовай прапаганды глыбока тлумачыць савецкім людзям асноўныя ідэі Тэзісаў ЦК КПСС, ярка расказваць аб гераічным жыцці У. І. Леніна, аб яго выдатнай ролі як заснавальніка пралетарскай партыі новага тыпу, тэарэтыка і правадыра сацыялістычнай рэвалюцыі.

Важнейшая задача камітэта камсамола — данесці да свядомасці кожнага камсамольца, кожнага маладога чалавека галоўныя гістарычныя вынікі руху нашай краіны па шляху, указанаму Леніным, глыбокі сэнс ленінскага наказу «вучыцца камунізму», вучыць іх жыць і працаваць па-ленінску.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

## РЫХТУЮЧЫСЯ ДА ЗНАМЯНАЛЬНАЙ ДАТЫ

Камуністы факультэта журналістыкі на чарговым партыйным сходзе абмеркавалі Тэзісы ЦК КПСС «Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» і ўсебакова прааналізавалі работу факультэта па падрыхтоўцы да юбілею правадыра.

Як адзначыў дакладчык, камуніст А. І. Раковіч, адпаведна плану, распрацаванаму партыйным бюро, дэканатам і кафедрамі, на факультэце шырока прайшло абмеркаванне пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна». У студэнцкіх групах адбыліся гутаркі аб Леніне-рэдактару, публіцысту, аб публіцыстах ленінскай школы. Многія першакурснікі пабывалі з экскурсіямі ў музеі I з'езда РСДРП. Пад кіраўніцтвам выкладчыка Г. З. Бегуна сабраны матэрыялы і зроблен стэнд «Ленін — стваральнік бальшавіцкага друку». Вядуцца работы па стварэнню фанатэкі ленінскіх выступленняў.

Творчымі дасягненнямі рыхтуюцца адзначыць Ленінскі юбілей выкладчыкі ўсіх кафедр і студэнцкі калектыў. Распрацоўваюцца артыкулы, прысвечаныя ленінскай тэме, для апублікавання ў друку, на радыё і тэлебачанні. Больш шырокая ленінская тэматыка прапанавана для курсавых і дыпломных работ. Студэнцкае навуковае таварыства плануе правесці ў сакавіку 1970 года канферэнцыю «Ленін і друк».

Унушальна выглядае друкаваная прадукцыя калектыву факультэта за мінулы год. Яна ўключае 51 назву і складае больш 70 друкаваных лістоў: гэта тры манаграфіі, зборнік навуковых прац «Пытанні публіцыстыкі», навуковыя артыкулы ў часопісах.

Цэнтрам навуковых інтарэсаў работнікаў факультэта была і застаецца ленінская тэматыка. Так, дацэнт М. С. Зярніцкі ў 1969 годзе падрыхтаваў да друку рукапіс манаграфіі «Вялікі майстар публіцыстыкі» (аб выступленнях У. І. Леніна ў друку ў 1918—1920 гг.). У часопісе «Полымя» (№ 11, 1969) апублікаван артыкул дэкана факультэта Р. В. Булацкага «Ленінскія газеты аб Беларусі», кандыдат гістарычных навук А. І. Раковіч падрыхтаваў для «Весніка БДУ» артыкул «Выданне і распаўсюджанне ў Беларусі твораў У. І. Леніна». У 1969 годзе выйшла ў свет кніга нарысаў і даследаванняў М. Я. Цікоцкага «У. І. Ленін і пытанні эстэтыкі публіцыстычнага слова». Стылю Леніна-публіцыста прысвечан яго артыкул «Слова таксама ёсць справа...» («Журналист», № 8, 1969).

Старшы выкладчык В. І. Дубовік апублікаваў артыкулы «Некаторыя асаблівасці зместу ленінскай публіцыстыкі», «Ленінская публіцыстыка. Некаторыя пытанні кампазіцыі і стылю», «Аб палемічным майстэрстве У. І. Леніна».

З захапленнем вядуць даследаванні па ленінскай тэматыцы і многія студэнты-журналісты. На канферэнцыі, прысвечанай 99-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, вялікую зацікаўленасць выклікалі даклады А. Смольскага (II курс) «У. І. Ленін — сатырык», В. Гурына (III курс) «У. І. Ленін у барацьбе з фразёрствам і пустаслоўем», Н. Кондрусевай (VI курс) «У. І. Ленін аб буржуазнай прэсе канца XIX ст.».

Пятнаццаць студэнцкіх работ былі прадстаўлены на гарадскім аглядзе. Сярод іх: «У. І. Ленін аб рускай газетнай перыёдыцы 80—90 гг. XIX ст.», «Ля вытокаў публіцыстычнай Ленініяны», «У. І. Ленін аб Герцэне».

Адзначыўшы поспехі ў падрыхтоўцы да Ленінскага юбілею, камуністы факультэта журналістыкі гаварылі аб тым, што яшчэ патрэбна зрабіць, каб дастойна сустрэць знамянальную дату ў жыцці ўсяго народа. Асаблівая ўвага была ўдзелена вучэбным справам, ходу экзаменацыйнай сесіі, пытанням выхавання моладзі.

**А. АЛЕНІЧ.**



Цяпер часцей, чым раней, вы можаце ўбачыць студэнтаў з падручнікамі і канспектамі, але шмат часу яны аддаюць і грамадскай рабоце. На факультэце журналістыкі, напрыклад, студэнты актыўна ўдзельнічаюць у афармленні нагляднай агітацыі. Іх рукамі створаны цікавыя фотастэнды — «Нядзеля», «Фотажурналіст», «Дзякуем факультэту», «Фотаінтэрв'ю» і іншыя. Нядаўна тут аформлена фотавыстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

На здымку ўнізе—студэнты журфака ў фоталабараторыі рыхтуюць новую экспазіцыю

Фота **Д. Чаховіча, Н. Марчанка.**



## УЗНАГАРОДА— ДОБРЫЯ АДЗНАКІ

**Да залікова-экзаменацыйнай сесіі на падрыхтоўчым факультэце, дзе вучацца 148 студэнтаў з ДРВ, рыхтаваліся загадзя. Выкладчыкі правялі ў групах дадатковыя заняткі, кансультацыі, гутаркі. Усё гэта дапамагло замежным студэнтам, якім за год трэба авалодаць рускай мовай і асновамі агульнаадукацыйных дысцыплін, лепш падрыхтавацца і больш паспяхова здаць залікі і экзамены.**

**У гэтую зімовую сесію ім патрэбна здаць дыферэнцыраваныя залікі па матэматыцы, фізіцы, хіміі, чарчэнню, курсу «Савецкі Саюз» і экзамен па рускай мове. Зразумела, у замежных сяброў шмат цяжкасцей, асабліва калі ўлічыць, што сёлета на факультэце вучацца студэнты з В'етнама, а в'етнамская мова вельмі адрозніваецца ад рускай і па фанетыцы, і па марфалогіі, і па сінтаксісу. І ўсё ж першыя вынікі сесіі сведчаць, што студэнты са сваёй нялёгкай задачай спраўляюцца паспяхова. Многія атрымліваюць добрыя і выдатныя адзнакі, а некаторыя здаюць экзамены і залікі толькі на выдатна. Студэнт Фам Хонг Дзіен з групы № 2 (ст. выкладчык Т. Л. Пятровіч), напрыклад, на выдатна здаў залікі па матэматыцы, курсу «Савецкі Саюз», чарчэнню і экзамен па рускай мове. Добра падрыхтаваліся да сесіі Нгуен Дык Чонг, Ле Бінь з групы № 15 (ст. выкладчык В. П. Вадэйка), Нгуен Чы Тхань (гр. № 16, ст. выкладчык З. Я. Какошнікава), Нго Дак Тан, Фам Тхі Тхе Ліен, Ву Тхі Хіеп, Хаанг Тхі Ван і многія іншыя.**

**У вучобе нашым сябрам дапамагае іх любоў да нашага народа, да мовы вялікага Леніна. Як расказаў дэкан падрыхтоўчага факультэта, загадчык кафедры грамадскіх дысцыплін дацэнт М. К. Гарбачоў, в'етнамскія студэнты з цікавасцю вывучаюць гісторыю нашай краіны; і таму не выпадкова, што многія з іх па курсу «Савецкі Саюз» паказалі добрыя і выдатныя веды.**

**Р. ЛУЧАНОК.**

# 100 САМЫ ЧАЛАВЕЧНЫ ЧАЛАВЕК

*(Працяг. Пачатак гл. у № 37, 1969 г. і № 1, 1970 г.).*

## ПАВАГА ДА ЛЮДЗЕЙ І ДАВЕР'Е ДА ІХ

Шчырасць і натуральнасць у адносінах да простых людзей, уласцівыя Леніну, паказвалі яго выключную павагу да працоўных, да тых, хто стварае матэрыяльныя каштоўнасці. Будучы сам у вышэйшай ступені працоўным чалавекам, У. І. Ленін умеў паважаць і цаніць працу іншых. «Сэрца яго білася гарачай любоўю да ўсіх працоўных»,— гаварыла аб ім Н. К Крупская [1].

Ленінская павага да людзей праяўлялася літаральна ва ўсім. Ён, напрыклад, ніколі не забываў падзякаваць чалавеку за аказаную яму паслугу, няхай нават самую нязначную, калі, скажам, у кабінет прыносілі газету. Прыбіральшчыца, якая распальвала печ у яго пакоі, заўсёды з хваляваннем расказвала, як ласкава і прыветліва гаварыў з ёй У. І. Ленін, калі заставаў яе ў сваім кабінеце.[2]

Будучы старшынёй Саўнаркома, ён ніколі не гаварыў «выклічце да мяне такога-та», а заўсёды—«запрасіце».[3] У тых жа выпадках, калі Уладзімір Ільіч адказваў каму-небудзь у прыёме, ён даручаў сакратару паведаміць аб гэтым абавязкова ў самай ветлівай форме. «Адківайце яму, — гаварыў ён,—але толькі вельмі ветліва».[4]

Е. Р. Левітас, якая была тады работнікам аднаго з райкомаў партыі г. Масквы, расказвае ў сваіх успамінах аб адной размове, што адбывалася летам 1920 года ў памяшканні Маскоўскага камітэта партыі. Тут у гэты дзень праходзіў сход партыйнага актыву Масквы, і на ім прысутнічаў Уладзімір Ільіч.

Па даручэнню райкома партыі Е. Р. Левітас выступала на гэтым актыве, але няўдачна. Калі ж таварышы ў кулуарах сталі асуджаць яе за дрэннае выступленне, то яна спаслалася выключна на сваё хваляванне. У гэты час да іх падышоў Уладзімір Ільіч, і яна тут жа звярнулася да яго з пытаннем:

— Уладзімір Ільіч, вы хвалюецеся, калі выступаеце?

Е. Р. Левітас піша, што У. І. Ленін уважліва пагледзеў на ўсіх і адказаў: «Я людзей паважаю, а таму, калі выступаю, канешне, хвалююся».[5]

Вось гэтая павага да людзей была характэрнай рысай Уладзіміра Ільіча. Ён, напрыклад, ніколі не прымушаў чакаць тых, хто прыходзіў да яго на прыём у дамоўлены час. У тых жа рэдкіх выпадках, калі ён затрымліваўся на некалькі хвілін у дзелавой гутарцы з іншым, раней завітаўшым работнікам, Уладзімір Ільіч роўна ў назначаны наведвальніку час выклікаў сакратара і даручаў папрасіць прабачэння ў чакаючага таварыша за невялікую затрымку.[6]

В. А. Смальянінаў расказваў, што аднойчы ў размове з ім Уладзімір Ільіч сказаў:

— Да вас паступіла скарга, просьба. Дык уявіце ж сябе на месцы скаржніка, пастарайцеся душой, сэрцам зразумець яго становішча. Уявіце, што гэта вам не адказваюць на заяву, што гэта вас не дапускаюць да начальніка, да якога вы імкняцеся трапіць. Або вось чалавек просіць кватэру. Паднатужцеся, напружце ўсю сваю фантазію і вобразна ўявіце сабе, што гэта ў вас няма кватэры, што гэта вы блукаеце з сям'ёй па вуглах... І тады вы напэўна знойдзеце магчымасць дапамагчы прасіцелю. Гэта не філантропія. Гэта камуністычны падыход да чалавека.[7]

І Ленін стараўся дапамагчы людзям, якія звярталіся да яго. Ён пісаў запіскі кіраўнікам устаноў або званіў ім па тэлефоне і прасіў дапамагчы таварышу. Іменна не загадваў зрабіць, а прасіў дапамагчы. У гэтых адносінах характэрна пісьмо Уладзіміра Ільіча колішняму наркому аховы здароўя рэспублікі М. А. Сямашку 28 лютага 1921 года.

У гэты дзень на прыёме у У. І. Леніна быў селянін сяла Фамінкі Уладзімірскай губерні І. А. Чакуноў, які прыязджаў у Маскву ў якасці хадака па грамадскіх і гаспадарчых справах сялян Фамінкаўскага сельскагаспадарчага таварыства. У ходзе гутаркі з І. А. Чакуновым па цікавячых сялян гэтай вёскі пытаннях Уладзімір Ільіч нечакана даведаўся, што яго субяседнік у дарозе згубіў акуляры, а купленыя ім на рынку другія аказаліся дрэннымі і амаль не дапамагаюць.[8] У. І. Ленін тут жа напісаў запіску М. А. Сямашку наступнага зместу:

«Мікалай Аляксандравіч!

У мяне сядзіць тав. Іван Афанасьевіч **Чакуноў,** вельмі цікавы працоўны селянін, які па-свойму прапагандуе асновы камунізма.

Ён згубіў акуляры, заплаціў за **дрэнь** 15000 р.! Ці нельга яму дапамагчы дастаць добрыя акуляры?

Вельмі прашу дапамагчы і папрасіць сакратара Вашага паведаміць мне, **ці ўдалося!»**[9]

Нельга не згадзіцца з М. А. Сямашкам, што ў гэтай запісцы сапраўды ўсё цудоўна: і змест, што паказвае клопаты аб працоўным чалавеку, якога ён бачыць першы раз у жыцці, і стыль: «папрасіць Вашага сакратара».[10]

Паважаючы людзей, У. І. Ленін, натуральна, і давяраў ім. Н. К. Крупская пісала, што «ён ні з кім не хітрыў, не дыпламатнічаў, не пускаў туман, і людзі адчувалі яго шчырасць і праматy».[11]

Уладзімір Ільіч цаніў самастойнасць людзей, дапамагаў ім стаць лепшымі, больш дзелавымі. Калі, напрыклад, Н. Асінскі, які працаваў тады намеснікам Народнага камісара земляробства, стаў у сваім пісьме да Леніна тлумачыць прычыну канфлікта, што адбыўся ў Наркомземе, наяўнасцю нібы інтрыг з боку асобных членаў калегіі, У. І. Ленін пісаў яму: «Тав. Асінскі!.. Каб весці такі наркамат, як Наркомзем, у такіх дз'явальскі цяжкіх умовах, трэба не бачыць «інтрыгу» або «супрацьвагу» ў інакш мыслячых або інакш падыходзячых да справы, а цаніць самастойных людзей».[12] Цяжка, канешне, было разлічваць на рост ініцыятывы супрацоўнікаў наркамата, калі за кожнай іх прапановай кіраўніцтва бачыла толькі інтрыгу!

Ленінская павага і давер'е да людзей праяўляліся і ў тым, што Уладзімір Ільіч ніколі не навязваў сваіх меркаванняў, не дзейнічаў голым аўтарытэтам. Т. С. Крываў, які быў у 1921 годзе членам ЦКК РКП(б), расказвае ў сваіх успамінах, як ён аднойчы звярнуўся да У. І. Леніна за «кіруючым ўказаннем» пры рашэнні персанальнай справы камуніста. Сутнасць гэтай справы ў наступным. У Маскве тады існаваў адкрыты па ініцыятыве Леніна дыскусійны клуб, на сходах якога часта разгараліся ажыўленыя спрэчкі па некаторых пытаннях унутрыпартыйнага жыцця. І вось на адным з такіх дыспутаў відны работнік Маскоўскай арганізацыі ў араторскім запале расказаў аб рашэнні, якое толькі рыхтавалася ўрадам і да агалошвання яшчэ не было прынята, г. зн. ён выдаў дзяржаўную тайну. ЦКК збіралася прыцягнуць гэтага таварыша да адказнасці, і Т. С. Крываў вырашыў параіцца па гэтаму пытанню з У. І. Леніным. Ён сустрэўся з Уладзімірам Ільічом, растлумачыў яму сутнасць справы і, як ён сам піша, закончыў свой расказ словамі:

— Чакаем вашага рашэння...

І далей адбылася наступная размова:

— Майго? — Ленін нават галаву ўскінуў ад здзіўлення. — Але чаму ж майго? Хіба я ЦКК? З'езд выбраў вас і вашых таварышаў. Вы і рашайце.

— Але ваша меркаванне, Уладзімір Ільіч?

— Вось гэта — іншая справа. Меркаванне магу выказаць. Я лічу, што ўчынак абуральны. Будзеце засядаць, можаце ўлічыць гэтае меркаванне, як выказанае адным з членаў партыі. Не больш... Ну, а што датычыцца меры спагнання, дык тут я змаўкаю. Гэта поўнасцю ў кампетэнцыі кантрольнай камісіі»...[13]

Гэта размова вельмі добра паказвае, як не любіў У. І. Ленін дзейнічаць толькі сваім аўтарытэтам, як верыў ён людзям і ў тое, што яны знойдуць правільнае рашэнне ўзнікшага пытання.

**Г. ГЕРАСІМЕНКА,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**
*(Працяг будзе).*

1. Н. К. Крупская. Воспоминания о В. И. Ленине. М., Госполитиздат, 1968, стр. 465.
2. Л. А. Фотиева. Из жизни Ленина. Стр. 50.
3. Штрихи великого портрета. Воспоминания о В. И. Ленине, стр. 51.
4. Л. А. Фотиева. Из жизни Ленина, стр. 112.
5. О Владимире Ильиче Ленине. Воспоминания, стр. 261.
6. Л. А. Фотиева. Из жизни Ленина, стр. 48—49.
7. Штрихи великого портрета. Воспоминания о В. И. Ленине, стр. 56.
8. Воспоминания о В. И. Ленине, ч. 2, стр. 609—610.
9. В. И. Ленин. Полн. собр. соч., т. 52, стр. 83—84.
10. Таким был Ленин, стр. 573.
11. Там же, стр. 582.
12. В. И. Ленин. Полн. собр. соч., т. 54, стр. 73.
12. Штрихи великого портрета, стр. 13—14.

# СЕСІЯ • СЕСІЯ • СЕСІЯ



Калі студэнт прыходзіць на экзамен з добрым запасам ведаў, то гутарка з выкладчыкам пакідае прыемнае ўражанне.

З задавальненнем ставіць дацэнт М. Я. Рэзнікаў чарговае выдатна ў залікоўку студэнта II курса хімфака Ю. Орліка.

А бывае і так...

## ВЫНІКІ ЦЕШАЦЬ, ВЫНІКІ АЗМРОЧВАЮЦЬ

Уводзіны ў літаратуразнаўства — гэта увахoдзіны ў цікавую і патрэбную для філолагаў навуку. Веды, набытыя на першым курсе, абавязкова спатрэбяцца і пры вывучэнні іншых дысцыплін і пры напісанні гуртковых і курсавых прац. Таму большасць студэнтаў-вячэрнікаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры (а размова пойдзе менавіта пра іх) з належнай адказнасцю і разуменнем паставіліся да вывучэння гэтага прадмета. Безумоўна, студэнтам-вячэрнікам займацца цяжэй, чым студэнтам стацыянара. Аднак А. Карловіч, Н. Герасімёнак, В. Слесарэнка, Н. Сілко, В. Позняк, М. Хадачынская, Л. Астапкевіч знаходзілі час падрыхтавацца да практычных заняткаў, рэгулярна наведвалі лекцыі. І вось вынік: выкладчык В. П. Рагойша ставіць ім у залікоўкі запаветнае выдатна. Дарэчы сказаць, у залікоўках В. Слесарэнка, В. Позняка, М. Хадачынскай, Н. Сілко гэта ўжо трэцяя выдатная адзнака — усе экзамены вытрыманы бліскуча...

У цэлым добра адказвалі і чацвёрачнікі — Г. Доўнар, Л. Карпук, Т. Нячай, А. Саламаха, В. Тарасевіч, А. Шаўко. А. Яноўская і інш.

З другога боку, некалькі адказаў на экзамене былі, мякка кажучы, ніжэй сярэдняга ўзроўню, пяць чалавек атрымалі нездавальняюча. В. Ахрамовіч, М. Кошчанка, Т. Матусевіч, Т. Мецька, І. Новік не змаглі адказаць на многія з пастаўленых пытанняў, не памяталі выказвання Ф. Энгельса пра рэалізм, горкаўскага вызначэння сюжэта і г. д. Не дапамог ім і паўторны білет. У чым жа прычына? Аказваецца, усе яны, хоць і наведвалі лекцыі, слухалі выкладчыка няўважліва, на практычных занятках пасіўнічалі або ўвогуле дрэнна рыхтаваліся да іх. А вядома, што вячэрнікі часу для самастойнай работы амаль не маюць, і таму лекцыі і практычныя заняткі для іх набываюць асабліва вялікае значэнне. Пагарджаць аўдыторнымі формамі навучання ім ніяк нельга.

**В. КАЧАНОВІЧ**







У ВЫНІКУ — ТОЛЬКІ ЗДАВАЛЬНЯЮЧА...
*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

### ВЕТЛІВАСЦЬ

*— Цябе падводзіць памяць мо', ці што?*
*Прафесар наш каля цябе прайшоў,*
*А ты не павітаўся з ім. Чаму?*
*— Дык я ж экзамены ўжо здаў яму!*

**М. ВЯРШЫНІН.**

ДАВАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ

# ШТО Ж ІМ ПЕРАШКАДЖАЕ?

Стаіш ля дошкі, тлумачыш дзяленне ядраў, бачыш дзесяткі дапытлівых і разумных позіркаў і думаеш: гэтыя студэнты і павінны быць лепшымі за нас, ранейшых студэнтаў, больш зацікаўленымі, крытычнымі, задзірыстымі, яны будуць задаваць многа пытанняў, не верыць, спрачацца. А калі гэтага не адбываецца, думаеш: «Саромеюцца. Затое на заліках яны пакажуць сябе!». Але я памылялася.

Прайшлі залікі, і мне ўдалося запомніць толькі трычатыры чалавекі. Астатнія паказвалі сярэднія веды. Я пытала ў іх: «У чым справа?» І вось якія адказы: «Здаем па два залікі ў дзень, некалі вучыць» (хоць на гэта ёсць класічны контрудар: трэба вучыць на працягу года!), «не хапае часу як належыць разабрацца, вывучыць».

Сапраўды, нельга спадзявацца на адзін-два дні ў перыяд сесіі, трэба вучыць у семестры. Але чаму ж усётакі не вучыцца? Можа, сярод усіх маіх студэнтаў і набярэцца каля дзесяці нядбайных або лянівых, але не верыцца, што ўсе астатнія—такія ж. Напэўна, сур'ёзна займацца на працягу навучальнага года ім нешта перашкаджае? Сапраўды, яны вельмі загружаны. Колькі раз я бачыла, што заняткі заканчваюцца толькі ў чатыры гадзіны дня. На шчасце для мяне, мае лекцыі былі першымі, ранішнімі, таму я бачыла перад сабой засяроджаныя твары. А якімі бачылі студэнтаў выкладчыкі, якія чыталі ў гэты дзень апошнюю лекцыю? А пасля лекцый бываюць яшчэ лабараторныя заняткі.

Акрамя таго, на мой погляд, праграма навучання ў радыёфізікаў размеркавана па семестрах не зусім добра. Напрыклад, квантавая механіка ў іх чытаецца ў шостым семестры, а ядзерная фізіка — у пятым. А некаторыя ж тэмы па ядзернай фізіцы проста немагчыма зразумець без ведання квантавай механікі. Вось і даводзіцца адначасова тлумачыць студэнтам квантавую механіку, яе апарат. Гэта і крыўдна, таму што нерацыянальна.

Лабараторныя заняткі таксама добра было б праводзіць паралельна з лекцыямі — у нас жа патрабуюцца справаздачы за кожную лабараторную работу, а гэта дае магчымасць студэнтам над многім падумаць, папрацаваць з кнігамі, знайсці адказы на незразумелыя пытанні; тут яны бліжэй да выкладчыка. Нарэшце, студэнты самі могуць праверыць ля прыбораў тое, што без такіх заняткаў застаецца для іх абстрактнай тэорыяй.

І яшчэ. Магчыма, варта падумаць аб увядзенні вольнага наведвання лекцый, перастаць нянчыць студэнтаў. Гэта, несумненна, падыме і ўзровень выкладання, і ўзровень ведаў студэнтаў: хто адчувае сваю сілу, у каго ёсць уменне і жаданне разабрацца ў чым-небудзь самастойна, той атрымае многа дадатковага часу для адукацыі. І ад гэтага мы ўсе толькі выйграем.

**Л. КАЧАРСКАЯ, асістэнт кафедры ядзернай фізікі.**





*Да позняга вечара не гасне святло ў вокнах новага будынка хімічнага факультэта: ідуць кансультацыі і экзамены, практычныя заняткі ў студэнтаў завочнага факультэта, напружана працуюць аспіранты.*

*На здымку М. НЕЧЫПАРЭНКІ вы бачыце аспірантку кафедры біяхіміі і біяфізікі С. Касінскую ў час работы ў лабараторыі.*

# ЦУДОЎНАЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ

Усё першае не забываецца: першы дзень у школе, першая адзнака, першы ў жыцці школьны вечар... Усё гэта яшчэ так свежа ў памяці! І вось зноў мы ў школе, толькі ўжо не як вучні, а як маладыя выкладчыкі, настаўнікі. Мы —гэта група студэнтаў геафака, поўныя маладога задору і жадання даць хутчэй свае першыя ў жыцці ўрокі.

Школа прыняла нас ветліва. Прасторны вестыбюль, каляровая мазаіка, чысціня...

Мы ў кабінеце дырэктара сярэдняй школы № 19. Васіль Паўлавіч уважліва прыглядаецца да нас, расказвае аб школе. Сам ён — выкладчык геаграфіі, і гэта неяк адразу збліжае нас. Выходзім з кабінета ўсхваляваныя, кожны адчувае вялікую адказнасць — быць скульптарам чалавечых душ.

Практыка пачалася таксама з хваляванняў. Мы былі першаадкрывальнікамі саміх сябе: то знаходзілі скрытыя магчымасці, то, наадварот, адсутнасць многіх неабходных педагогу якасцей. Спачатку проста вучыліся майстэрству ў вопытных выкладчыкаў, наведвалі ўрокі па геаграфіі, чарчэнню, літаратуры. Седзячы за апошнімі партамі, мы, шасцёра студэнтаў, ацэньвалі кожнае слова, жэст, усмешку, уменне падносіць цяжкі матэрыял лёгка і прыгожа... Нашы настаўнікі-географы былі вельмі розныя: маладая строгая Інэса Іосіфаўна і вопытны педагог, цудоўнай душы чалавек Клаўдзія Нікіціна. Якую вялікую дапамогу аказвалі яны нам, колькі такту і ўмення ўкладвалі ў свае заўвагі! Вялікае ім дзякуй!

Але вось настала самае цяжкае — першыя самастойныя ўрокі. Кожны з нас павінен быў даць 10 урокаў (па два ў кожным класе — з 5-га па 9-ы). Успамінаюцца першыя ўрокі Барыса Саітгарэева (ён паклаў пачатак нашай практыцы). Усе мы настолькі хваляваліся за яго, што гэта немагчыма перадаць словамі. Урок у 9-м класе прайшоў выдатна, Барыс вёў яго ў нейкай асабліва спакойнай манеры, толькі на скроні прыкметна пульсавала сіняя жылка: адчувалася хваляванне...

Пасля ўрока, у час бурнага абмеркавання, мы далі волю сваім пачуццям.

А потым пайшлі ўрокі адзін за другім, усе розныя, адзін лепшы, другі крыху горшы, але на кожным з іх мы рабілі невялікія адкрыцці ў методыцы, якія надавалі нам упэўненасць. Рыхтаваліся да заняткаў старанна, хацелася выйсці за межы падручніка; затое ніяк нельга было выйсці за межы ўрока.

У ходзе практыкі ў кожнага з'явілася свая асаблівая манера выкладання: змястоўныя ўрокі-лекцыі Валодзі Сідарэнкі і Валодзі Шаркова, жывыя, у форме гутаркі — Жэні Пліпера ў 5-м класе. Але асабліва хочацца адзначыць тую ўвагу і патрабавальнасць, з якой адносіся да ўрокаў Станіслаў Рослік. Спачатку ён крыху саромеўся ў класе: адчувалася тое, што яму не даводзілася выступаць перад вялікай аўдыторыяй — а к канцу практыкі ён быў ужо ўпэўненым гаспадаром у класе. Ды і ўсе студэнты раслі ад урока да ўрока: з'явілася ўменне правільна размяркоўваць час і засяроджваць увагу вучняў, прыйшлі ўпэўненасць і спакой. А як хацелася даць вучням як можна больш цікавага, новага!

Я, напрыклад, вяла заняткі ў двух, можна сказаць, палярных класах — 9-м і 5-м і павінна адзначыць, што гэта было нялёгка. Затое колькі карысці мне гэта дало! Даводзілася выкарыстоўваць розныя формы работы, часта іх мяняць. Асаблівае задавальненне я атрымлівала ў 5-м класе, дзе была класным кіраўніком. Мне хацелася, каб у маім расказе ажывала карта, каб проста і лёгка дзеці ўспрымалі цяжкія паняцці. Дома праседжвала над канспектамі, шукала тое галоўнае, без чаго ўрок быў бы шэрым, падбірала параўнанні, якія б абапіраліся на асабісты вопыт дзяцей, прыдумвала тэксты да малюнкаў...

А як цікава было весці пазакласную работу! Тут дзеці былі крыху іншымі: можа нават больш гаманлівымі і больш блізкімі мне. Мы рэпеціравалі складзеныя намі частушкі, выпускалі насценгазеты, і, калі я бачыла ў іх вачах захапленне, на мне ўсё больш укаранялася думка, што быць педагогам — справа не толькі важная, але і цудоўная. Педагог, які прывівае матэрыялістычны светапогляд, лепшы сябра вучняў, якія любяць і вераць яму, — што можа быць лепш!

На пытанне, што мне дала практыка, я з упэўненасцю магу адказаць — многа, настолькі многа, што выказаць цяжка. У гутарцы з дзецьмі, у творчай працы, у пошуку разумееш, як адказна быць настаўнікам — скульптарам чалавечых душ.

**Т. ПАЎЛЫШНА, студэнтка V курса геолага-геаграфічнага факультэта.**

## СПОРТ

### ПЕРАМАГЛІ ГАСПАДАРЫ

**17—18 студзеня ў спортзале адбыліся сустрэчы па валейболу паміж камандамі супрацоўнікаў БДУ і універсітэта г. Чарнаўцы.**

**Сустрэча пачалася ўрачыстым парадам удзельнікаў. Са словамі прывітання выступіў Віктар Фёдаравіч Кавалёў — старшыня спартыўна-масавай камісіі мясцкома БДУ. Каманды абмяняліся вымпеламі і значкамі. Гульня праходзіла ў цёплых сяброўскіх абставінах.**

**Абедзве сустрэчы выйграла каманда нашых супрацоўнікаў з лікам 3 :0 і 3 : 1.**

***

### «ЗДАРОЎЕ» НА ПРАВЕРЦЫ

У снежні мінулага года закончылася спартакіяда «Здароўе», у якой прынялі ўдзел зборныя каманды супрацоўнікаў і выкладчыкаў дзевяці ВНУ горада Мінска. Спаборніцтвы праходзілі па чатырох відах спорту: валейболу, баскетболу, стральбе, настольнаму тэнісу.

У асноўным выступалі супрацоўнікі розных факультэтаў і кафедр, якія займаліся ў групах «Здароўе».

У выніку вострай спартыўнай барацьбы супрацоўнікі нашага універсітэта сталі пераможцамі спартакіяды і ўзнагароджаны пераходным прызам і граматай.

У гэтым годзе будзе праведзена спартакіяда па шасці відах спорту. Спаборніцтвы пачнуцца ў лютым.

**В. КАВАЛЁЎ.**

## У ДНІ ЗІМОВЫХ КАНІКУЛ

**Камітэт камсамола і кафедра фізічнага выхавання і спорту арганізуюць выезд у падшэфны калгасы брыгады мастацкай самадзейнасці і групы спартсменаў з паказальнымі выступленнямі. Сваё майстэрства прадэманструюць самадзейныя артысты, а таксама цяжкаатлеты, акрабаты, гімнасты і майстры мастацкай гімнастыкі.**

**З 27 студзеня студэнты і супрацоўнікі змогуць прыняць удзел у штодзённых лыжных паходах па бліжэйшых раёнах Мінскай вобласці. Узначаляць паходы выкладчыкі кафедры фізвыхавання і спорту.**

*МАРШРУТЫ ПАХОДАЎ І ЧАС СТАРТАЎ:*

**27 студзеня. Па Мінскім моры. 15 км, 8.30.**
**28 » Ст. Радашковічы—Маяк—ст. Вязынка. 18 км, 8.00.**
**29 » Стаўбцы — Мікалаеўшчына. 14 км, 8.00.**
**30 » Спортбаза «Стайкі» — Трасцянец — Мінск. 15 км, 7.30.**
**31 » Курган Славы—Раубічы — Астрашыцкі гарадок. 18 км, 8.00.**
**1 лютага. Ваколіцы Лагойска. 20 км, 8.00.**
**2 » 55-ы км Лагойскай шашы — Хатынь. 15 км, 8.00.**
**3 » Ст. Аляхновічы—Вязынка—ст. Радашковічы. 18 км, 8.00.**
**4 » Па Мінскім моры. 18 км, 8.30.**
**5 » Пас. Радашковічы—помнік Гастэлу—Вязынка. 15 км, 8.00.**

**Жадаючыя ўдзельнічаць у гэтых паходах збіраюцца на лыжнай базе (10-павярховы інтэрнат № 6 па вуліцы Кастрычніцкай) у назначаны час.**

**Што браць з сабой:**
**1. Халодную або гарачую страву ў разліку на адзін дзень.**
**2. Грошы на праезд у аўтобусе або на поезде.**
**3. Неабходнае спартыўнае адзенне.**
**4. Лыжы можна атрымаць на лыжнай базе па заліковых кніжках.**
**5. Не забудзьце студэнцкі білет!**

**В. ХРЭНАЎ.**

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА



## КАРЫСНАЕ ВЫДАННЕ

**Усім, хто вывучае жыццё і дзейнасць вялікага правадыра працоўных, несумненную дапамогу акажа тэматычны спіс новай літаратуры аб У. І. Леніне, які падрыхтаваў і выдаў у выглядзе брашуры даведніцка-бібліяграфічны аддзел універсітэцкай бібліятэкі. Гэты спіс уключае 21 раздзел па самых разнастайных пытаннях: «Рысы У. І. Леніна як чалавека», «Роля У. І. Леніна ў развіцці навукі», «У. І. Ленін і літаратура», «У. І. Ленін і Беларусь» і г. д.**

## УЗЛЁТАЎЦЫ ВА ЎКРАІНСКАЙ АНТАЛОГІІ

Творчасць членаў літаратурнага аб'яднання «Узлёт» (кіраўнік Алег Лойка), якое працуе пры газеце «Беларускі універсітэт», добра вядома ў нашай рэспубліцы. Юныя паэты і паэтэсы неаднойчы выступалі перад студэнцкай і рабочай аўдыторыямі, іх творы — нярэдкія госці на старонках часопісаў і шматлікіх рэспубліканскіх газет. Але ў апошні час узлётаўцы сталі ўсё часцей «залятаць» і за межы Беларусі. Так, творы Жэні Янішчыц друкавалі «Известия», «Литературная газета», часопіс «Молодая гвардия», украінскі альманах перакладной літаратуры «Сузір'я». Юрку Голуба перакладалі нямецкія студэнты ў Іене і украінскія — у Львове. Прыкладаў можна прыводзіць больш. Усе яны сведчаць пра немалыя творчыя здабыткі студэнтаў нашага універсітэта, пра іх пасільны ўклад ва ўмацаванне інтэрнацыянальных сувязей паміж савецкімі народамі, іх літаратурамі.

Апошнія дні мінулага года прынеслі яшчэ адну добрую вестку: на Украіне выдавецтва ЦК камсамола рэспублікі «Молодь» выпусціла ў свет вялікую анталогію маладой беларускай паэзіі «Калінавыя масты». У яе ўвайшлі творы і некаторых нашых студэнтаў, сённяшніх членаў «Узлёту». Маладая паэтэса Яраслава Паўлычка пераклала на украінскую мову вершы Жэні Янішчыц «...Гэта туды вядуць усе сцежкі», «...Люблю глухіх бароў гудзенне», «Краю сіні мой», «...Тваё імя — на голлях іней». Тры перакладчыкі — Грыгорый Кочур (ён жа складальнік анталогіі), Лесь Танюк і Еўдакія Брынцава — пераклалі вершы Юркі Голуба «Бацьку», «...Дурныя спрэчкі і размовы», «Зіма», «...Калі не пішуцца вершы», «Дарога ў Будапешт», «...Салгаць усё ж немагчыма!», «...А за кручамі».

Трапілі ў кнігу і вершы сённяшняга аспіранта Рыгора Семашкевіча «Каляровыя сны», «Леснічоўка», «Аўтабіяграфія» і інш. Калі складалася анталогія, на трэцім курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры вучыўся Алесь Разанаў, апошні, пяты курс заканчвалі Мар'ян Дукса, Вольга Іпатава, Валянціна Коўтун. Іх творы таксама ўвайшлі ў кнігу.

Як вядома, многія беларускія паэты закончылі наш універсітэт яшчэ да стварэння «Узлёту» (1963 г.). Адны з іх, як Ніл Гілевіч і Алег Лойка, звязалі свой далейшы лёс з роднай альма-матэр, працуюць сёння тут як выкладчыкі. Другія — Р. Барадулін, А. Вярцінскі, В. Зуёнак, Я. Сіпакоў, М. Стральцоў, Ю. Свірка і шэраг іншых — падтрымліваюць з універсітэтам цесную сувязь, выступаюць на нашых літаратурных вечарах, дыспутах. Мы, студэнты і выкладчыкі універсітэта, маем поўнае права залічваць іх у свой актыў, ганарыцца імі як добрымі сваякамі. Таму вельмі радасна, што сярод аўтараў «Калінавых мастоў» ёсць шмат студэнтаў нашага універсітэта 50-х — пачатку 60-х гадоў. Гэта—вышэйназваныя паэты, а таксама Г. Кляўко, М. Арочка, К. Цвірка, У. Паўлаў, Г. Бураўкін, У. Карызна, Хв. Чэрня, В. Макарэвіч, А. Сербантовіч, М. Маляўка, В. Вярба — усяго дваццаць пяць чалавек з усіх сарака трох аўтараў паэтычнага зборніка! Як бачыце, сённяшнюю беларускую маладую паэзію за межамі рэспублікі (а ў анталогію трапілі паэты, пачынаючы з 1930 года нараджэння) у асноўным прадстаўляюць выхаванцы нашага універсітэта. Ці не паказальны гэта факт?! Ці не яскравы гэта доказ значнага ўдзелу БДУ імя У. І. Леніна ў развіцці не толькі беларускай, а ўвогуле ўсёй савецкай культуры?! Бо калінавыя масты дружбы, якія ўзводзіць літаратура, садзейнічаюць духоўнаму ўзаемаўзбагачэнню літаральна ўсіх народаў нашай неабсяжнай краіны.

Анталогію «Калінавыя масты» адкрывае прадмова пра «новы вырай» беларускай паэзіі, напісаная доктарам філалагічных навук Алегам Антонавічам Лойкам. У прадмове сцісла разгледжаны асноўныя праблемы, матывы, стылёвыя кірункі маладой беларускай паэзіі, паказаны яе здабыткі і пошукі. Алег Лойка гаворыць і пра папярэднікаў, настаўнікаў маладых, сцвярджаючы пераемнасць пакаленняў, бесперапыннасць абнаўлення літаратуры.

У заключэнне хочацца падзякаваць тым, хто данёс слова універсітэцкіх паэтаў (і не толькі іх) да ўкраінскага чытача. Перш за ўсё — складальніку кнігі і аднаму са старэйшых майстроў перакладу Грыгорыю Кочуру. Актыўны ўдзел у стварэнні кнігі прынялі і паэты-перакладчыкі Р. Лубкіўскі, Ул. Лучук, М. Пятрэнка, А. Сенатовіч, Д. Паламарчук, Д. Чараднічэнка, І. Гнацюк і іншыя. Усім ім — наша студэнцкае дзякуй!

**В. РАГОЙША.**

## ТРЭЦЯГА ШЛЯХУ НЯМА

Загаловак новага рамана Ус. Кочатава «Чаго ж ты хочаш?» прымушае ўспомніць публіцыстычна накіраваныя назвы класічных «Хто вінават?», «Што рабіць?» і «Дык што ж нам рабіць?», толькі з большай блізкасцю да чытача, з якім пісьменнік уступае ў прамы і прынцыповы дыялог кароткай і загаднай формай звароту, напамінаючы адзін з першых рэвалюцыйных плакатаў.

Талент Ус. Кочатава блізкі да тургенеўскага: аўтар заўсёды знаходзіцца ў коле самых актуальных, хвалюючых праблем сучаснасці. Невыпадкова з'яўленне кожнага яго рамана суправаджаецца абмеркаваннямі, дыскусіямі, канферэнцыямі чытачоў.

Уменне ўлавіць самую істотную тэндэнцыю пераменлівага на вачах жыцця, спыніць і адлюстраваць у мастацкім слове жывую думку і дыялектыку пачуццяў сучасніка —бясспрэчная заслуга пісьменніка.

Але галоўнае, што характарызуе Кочатава як прадстаўніка сацыялістычнага рэалізму, паслядоўніка горкаўскіх традыцый у нашай сучаснай літаратуры — гэта пачуццё партыйнасці, якім пранікнуты ўсе яго творы, палітычная вастрыня і бескампраміснасць.

Раман «Чаго ж ты хочаш?» — ідэалагічны. Яго з'яўленне аказалася сінхронным і сугучным аб'яднанаму пленуму праўленняў творчых саюзаў СССР, які адбыўся нядаўна ў Маскве. Мастацкія вобразы рамана Ус. Кочатава раскрываюць тэарэтычныя палажэнні, якія былі вылучаны на пленуме ў выступленнях Г. Маркава, А. Чакоўскага, С. Міхалкова і іншых.

Натхнёная ідэямі ленінізма, пранікнутая пачуццямі інтэрнацыяналізму, савецкая літаратура вядзе барацьбу з класава варожымі сіламі рэакцыі, за мір і прагрэс. Антыкамунізм імкнецца парушыць маральна-палітычнае адзінства нашага грамадства, буржуазія імкнецца раскалоць інтэлігенцыю і паставіць яе сабе на службу.

Пісьменнікі нясуць адказнасць за ход думак. Аб гэтым сведчыць творчая практыка Ус. Кочатава. У сваім рамане аўтар паказвае тыя шматлікія каналы, якія выкарыстоўвае буржуазная прапаганда, каб унесці атруту чужой ідэалогіі. Пад выглядам вучоных, якія займаюцца даследаваннямі рускіх старажытнасцей, прыязджаюць у Савецкую краіну замаскіраваныя ворагі: былы эсэсавец Клауберг, амерыканцы Порцыя Браун і Юджын Рос, пасланыя з мэтай разлажэння, падпілоўвання маральных устояў нашага грамадства. Аматары старажытнага мастацтва на самай справе варожыя дыверсанты ў ідэалагічнай барацьбе Захаду, антыкамунізму, супраць Савецкага Саюза.

Іх стаўка — знайсці незадаволеных, якія маюць «рахункі» з Савецкай уладай—аказваецца бітай; застаецца арыентавацца на людзей маральна няўстойлівых або маласвядомых, якіх паказвае пісьменнік, выкарыстоўваючы некаторую ступень перабольшання, увогуле дапусцімага ў творах мастацтва для больш яркага раскрыцця галоўнай думкі.

Юджын Рос спрабуе загнаць клін паміж старым і маладым пакаленнямі, пераканаць юнакоў, што ім са старымі немагчыма ісці па адной дарозе. Порцыя Браун здзіўляе акружаючых, па словах пісьменніка, «смярдзючым стрыпцізам» і замежнымі цацкамі. Гэтыя «прыхільнікі мастацтва» ўсяляк спрабуюць падтрымаць скепсіс адных, лёгкадумнасць другіх, іх задавальняе, калі інтэлігент адыходзіць ад палітыкі: неарусафіл, ідэалізуючы старадаўнасць, паэт Сава Багародзіцкі не супраць увайсці ў сяброўскія адносіны з чужаземцамі, а сям'я дацэнта Зародава, дзе, па выказванню гаспадара, англійская мова набыла права другой дзяржаўнай, а гасцінная ў доме называецца не інакш як «сіцінгрум», знаходзіцца ў стане святочнага ажыятажу ў чаканні, калі наведаюць іх заморскія госці. Сын Зародава Генадзь круціцца вакол іншаземцаў, любіць валюту, займаецца дробным уласным прадпрыймальніцтвам і, нарэшце, як і трэба было чакаць, прымае на сябе зняважу ад тых, каму дагаджаў: пасля выпітага кан'яку Клауберг, які застаўся з ім адзін на адзін, метадычна і жорстка збівае Генадзя, так што той губляе прытомнасць, а ачнуўшыся, знаходзіць на стале стодоларавую купюру як плату за пабітае цела.

Генадзь не ведае, што Клауберг, ваюючы ў гітлераўскай арміі, у 1942 годзе на станцыі Чудава катаваў вяснушчатага хлопчыка, які перад смерцю плюнуў яму ў твар. Затоеная нянавісць да савецкіх хлопцаў, якія прагналі заваёўнікаў і абсеклі кіпцюры нямецкаму фашызму, прабуджаецца ў Клауберга з новай сілай, і праз вінны чад Генадзь пачынае яму здавацца тым вяснушчатым, вечна жывым рускім хлопчыкам.

Пачуццём высокага чалавечага гонару і савецкай гордасці дыхаюць старонкі кочатаўскага рамана, поўныя зняваг да тых, хто забывае аб сваёй прыналежнасці да вялікага народа.

Смешным і нікчэмным выглядае нейкі модны літаратар, які выступаў у капіталістычнай краіне і заклікаў да міру, дружбы і братэрства — каго? — былых гітлераўцаў. А якая з імі можа быць дружба? Незнаёмы малады чалавек у час гэтага выступлення ўстаў і сказаў паэту: «Мне вас было соромна слухаць. Я рускі, я за Расію ў агонь пайду, я за яе зямлю есці буду. А вы там жывяце, вы шчаслівы, і замест таго, каб горда трымаць галаву перад гэтымі баварскімі каўбаснікамі, круціцеся перад імі».

Усёй сістэмай сваіх мастацкіх вобразаў пісьменнік даказвае немагчымасць мірнага суіснавання варожых ідэалогій. Антыкамунізм імкнецца парушыць маральна-палітычнае адзінства інтэлігенцыі. «Інтэрнацыянальны доўг, гістарычная адказнасць за будучыню свету робіць нас актыўнымі ўдзельнікамі барацьбы паміж сіламі прагрэсу і рэакцыі на сусветнай арэне». У гэтай барацьбе не можа быць выбару, як няма і трэцяга шляху.

У рамане мінулае пераклікаецца з сучаснасцю. Кочатаў успамінае, як гітлераўцы, якія цяпер працуюць у званні прафесараў мастацтваў, грабілі Пскоў і Ноўгарад і спалілі ўсіх жыхароў вёскі Красуха, лёс якой нагадвае беларускую Хатынь і тысячы іншых вёсак на нашай зямлі.

Сабураў задае Генадзю пытанне самога пісьменніка: «Чаго ж ты хочаш?.. Ты хочаш, каб у вашай Расіі скончылася Савецкая ўлада? Ты хочаш новых Майданекаў і Асвенцымаў, Равенсбрукаў і Бухенвальдаў? Ты хочаш, каб рускіх і ўсіх іншых, хто складае савецкі народ, ператварылі ў пыл для ўгнаенняў еўрапейскіх або амерыканскіх палёў?» Трэцяга шляху няма.

Вуснамі пісьменніка Булатава, у вобразе якога адчуваюцца аўтабіяграфічныя элементы, Ус. Кочатаў звяртаецца да маладога пакалення, як той плакат, што пытае: «Ты запісаўся добраахвотнікам?» На табе ляжыць адказнасць за лёс краіны і за лёс камуністычнага заўтра на зямлі.

Раман «Чаго ж ты хочаш?» — востра публіцыстычны, сумленны і страсны твор пісьменніка-камуніста. Ён, несумненна, дапаможа асобным прадстаўнікам нашай інтэлігенцыі перагледзець свае адносіны да моды, якая ідзе з Захаду, дапаможа ацаніць тых, хто, пачынаючы з захаплення анучамі і гітарыстамі, ператвараецца ў духоўных фарсаўшчыкоў.

Аб'ектам буржуазнага нацкоўвання не выпадкова становіцца савецкі пісьменнік Булатаў, таму што ён добра ўсведамляе сваё месца ў сучаснай ідэалагічнай барацьбе як абаронцы ленінскіх ідэй партыйнасці і народнасці, актыўнага барацьбіта за камунізм.

Ус. Кочатаў выбірае розныя магчымыя варыянты: ён паказвае савецкіх людзей за мяжой, іншаземцаў у СССР, белаэмігрантаў, якія ваявалі ў гітлераўскіх войсках, і эмігрантаў, якія змагаліся супраць фашыстаў, а пасля вайны вярнуліся ў Расію, людзей, якія на некаторы час пакінулі радзіму і мараць хутчэй набыць яе зноў. Ён з матэматычнай дакладнасцю даказвае: савецкі чалавек, у прыватнасці інтэлігент, павінен добра ўсведамляць, якія ідэалагічныя дыверсіі выкарыстоўвае працiўнік, і супрацьстаяць ім, трымаючы высока сцяг нацыянальнай гордасці і савецкага патрыятызму.

**Н. РАМАШКА,**
дацэнт.

1. Вс. КОЧЕТОВ. Чего же ты хочешь? «Октябрь», №№ 9—11, 1969.

## НОВАЯ СУСТРЭЧА

Барыс Стральцоў вядомы беларускаму чытачу не толькі як журналіст, але і як аўтар мастацкіх твораў. Яго апавяданні на працягу апошніх год даволі часта з'яўляліся на старонках часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Беларусь» і іншых перыядычных выданняў. Нядаўна ў выдавецтве «Беларусь» пад назвай «Сыходзяцца бальшакі і прасёлкі» выйшла другая кніжка пісьменніка. Яна з'яўляецца як бы працягам першай — зборніка апавяданняў пад назвай «Наследнік». Тут аўтар расказвае аб сённяшнім дні калгаснай вёскі, аб буднях рабочых, інтэлігенцыі, студэнтаў. Са старонак зборніка паўстаюць і малады канструктар, і кранаўшчыца, і маленькі сялянскі скрыпач, што іграе 5-ю сімфонію Чайкоўскага, і стары селянін, і пасівелая маці, у якой вайна забрала адзінага сына. Аб кім бы ні расказваў пісьменнік, у кожным творы адчуваюцца яго жывая прысутнасць, яго асабістыя адносіны да таго ці іншага героя.

У тканіну многіх апавяданняў арганічна ўплятаюцца эпізоды з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Сюжэт апавядання «Траса», напрыклад, пабудаван на ўспамінах галоўнага героя, жыццёвыя дарогі якога прыводзяць у памятны для яго Дрычын. Нечаканая камандзіроўка яшчэ раз нагадвае ваенныя падзеі, горкі лёс чатырнаццацігадовых падлеткаў, якія загінулі ад рук ворагаў.

Аўтара зборніка «Сыходзяцца бальшакі і прасёлкі» вылучаюць умелае выкарыстанне фактычнага матэрыялу, майстэрскае выражэнне пастаўленай тэмы, лаканічная і сакавітая мова. Многія творы Б. Стральцова напісаны на фактах з уласнай біяграфіі. І, відаць, таму яны так эмацыянальна ўздзейнічаюць на чытача, пакідаюць у яго душы глыбокае ўражанне.

**С. САС,**
студэнтка
IV курса журфака.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 21366. Зак 118.